# Рэцэнзіі

У. Емельянчык. **Паланез для касінераў: (З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі на Беларусі).** Мн.: Беларусь, 1994. 160 с.

Кніга У.П.Емельянчыка прысвечана праблеме, якая амаль не распрацавана ў гістарыяграфіі Беларусі, – паўстанню 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Дастаткова нагадаць, што ў пяцітомнай "Гісторыі Беларускай ССР" 70-х гг. гэтая падзея нават не ўзгадваецца. Савецкая гістарыяграфія ўвогуле абмежавалася артыкулам У.І.Пічэты "К истории восстания Костюшко", апублікаваным у "Вучоных запісках інстытута славяназнаўства" ў 1953 г. Лічылася, што гэта з'ява толькі польскай гісторыі і таму вывучэнне яе на Беларусі было ледзь ці не падазроным. Польскія ж гісторыкі, у сваю чаргу, падрабязна распрацавалі праблематыку гэтага паўстання, але, нягледзячы на шматлікасць публікацый і акцэнтаў, беларускі кантэкст паўстання там не закрануты.

Першапачаткова ў кнізе У.П.Емельянчыка асвятляецца абстаноўка 90-х гг. XVIII ст. на Беларусі, якая прывяла да паўстання: гэта сацыяльна-эканамічны і палітычны стан грамадства Рэчы Паспалітай, спробы яго рэфармавання і выратавання краіны ад гібелі, нахабнае ўмяшанне суседніх дзяржаў ва ўнутраныя справы. Перад чытачом паўстаюць вобразы самаадданых барацьбітоў за захаванне Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага, за "вольнасць, цэласць, незалежнасць" Айчыны. Паказана і здрадніцкая дзейнасць тых, хто ў цяжкі для "дзяржавы абодвух народаў" час прадаваў яе прускім, расійскім і аўстрыйскім захопнікам. Зоркамі першай велічыні выступаюць асобы кіраўніка паўстання ў Літве і Беларусі Якуба Ясінскага і нашага вялікага земляка Тадэвуша Касцюшкі. (Апошняму, дарэчы, прысвечана спецыяльная кніга аўтара, напісаная разам з прафесарам Я.Юхо "Нарадзіўся я ліцьвінам". Мн., 1994.)

Даволі пераканаўча раскрыты падзеі паўстання 1794 г. на беларускіх землях, яго падрыхтоўка, пачатак, распаўсюджванне, маштабы і ход ваенных дзеянняў. Прагледжаны баявы шлях паўстанцкіх атрадаў, рэальна ацэнены іх вайсковыя магчымасці, прааналізаваны памылкі ў агульным кіраўніцтве імі і рэальныя шансы ў барацьбе з пераўзыходзячымі сіламі расійскіх войскаў. Не выклікае пярэчанняў і характарыстыка ролі А.В.Суворава ў беларускай гісторыі, асоба якога была неапраўдана ўзвялічана і рамантызавана савецкай гістарыяграфіяй. Паўстанне слушна падаецца як сапраўды народнае, з удзелам не толькі шляхты, але сялян і мяшчан.

Сялянству на старонках кнігі ўдзяляецца асаблівая ўвага. І гэта не выпадкова, бо ад яго ўдзелу як асноўнай масы насельніцтва ў вырашаючай ступені залежаў поспех паўстання. Гэта разумеў і супрацьлеглы бок – царскі ўрад. Таму барацьба за сялянскія душы набыла шырокі размах. Касцюшка, Ясінскі, іншыя радыкальна настроеныя кіраўнікі былі гатовыя да кардынальнага вырашэння сялянскага пытання, аж да поўнага скасавання прыгонніцтва. Аднак асноўная маса шляхты, і асабліва землеўладальнікі, да такіх кардынальных крокаў былі яшчэ не падрыхтаваны, што і абумовіла абмежаванасць Паланецкага універсалу і тым больш магчымасці яго рэалізацыі. Царскія ж генералы давалі сялянам дэмагагічныя абяцанні і настройвалі іх супраць паўстанцкай шляхты, што, справядліва адзначае аўтар, з'явілася адной з прычын абмежаванага ўдзелу сялян у паўстанні і нейтральна-пасіўнай пазіцыі іх асноўнай масы.

Праз усю манаграфію праходзіць тэма самастойнасці паўстання на літоўска-беларускіх землях, г.зн. максімальная ўвага ўдзяляецца толькі цяпер паднятай па-сапраўднаму ў нашай гістарыяграфіі праблеме "ліцьвінскага сепаратызму". Як раз у гэтым так званым сепаратызме і высвечваецца месца і роля нашых зямель у паўстанні: што дала б нам перамога – далейшую паланізацыю ці адкрыла б перспектывы самастойнага дзяржаўнага ўладкавання? Перамогі не атрымалася, але як бачна па матэрыялах кнігі, ліцьвінскі фактар у рознай ступені праяўляўся ў дзейнасці розных кіраўнікоў паўстання, што тлумачыцца як ступенню іх агульнай паланізацыі, так і прывязанасцю да роднай зямлі і адданасцю мясцовым традыцыям. Дзяржавы ж, якія анэксавалі тэрыторыю Рэчы Паспалітай і ў крыві падавілі паўстанне Касцюшкі, ушчэнт руйнавалі дзяржаўнасць, якая стагоддзямі тут складвалася, не пакідаючы ніякіх нацыянальна-дзяржаўных перспектыў не толькі польскаму, але і літоўскаму, беларускаму, украінскаму народам.

Што ўдалося, што не ўдалося аўтару можна меркаваць з яго вызначэння кнігі як спробы

першага набліжэння да "беларускага следу" ў паўстанні 1794 г. І гэты след ён выявіў. Абагулена вялікая колькасць навуковай літаратуры і апублікаваных матэрыялаў, якія датычацца нашай тэрыторыі; зроблена даволі плённая спроба росшуку дакументаў у мінскім і маскоўскіх архівах. Папулярны выклад тэксту, наяўнасць шматлікіх ілюстрацый робяць кнігу даступнай і цікавай не толькі спецыялістам, але і шырокаму колу беларускіх чытачоў.

**Л.А.Жылуновіч, Ю.Л.Казакоў, У.А.Сосна**

В.Ф.Берков, Я.С.Яскевич, В.И.Павлюкевич. **Логика**. Учебное пособие для высших учебных заведений. Мн.: "ТетраСистемс", 1996. 415 с.; Издание второе, исправленное и дополненное. Мн., 1997. 479 с.

Содержание обоих изданий в основном совпадает. Во втором добавлена новая глава "Обучение", параграф 8 – "Художественные тексты" в шестой главе второй части.

Написание глав и параграфов обоих изданий распределено между авторами весьма неравномерно. "Предисловие", вторая глава второй части "Общение (Словесный диалог)" и "Вместо заключения. Краткий очерк истории логики" написаны совместно В.Ф.Берковым и Я.С.Яскевич. В.И.Павлюкевич написал §§1–4 гл.2 первой части и §8 шестой главы второй части во втором издании. Все остальные главы и параграфы написаны проф. В.Ф.Берковым, в том числе "Введение. Предмет логики как науки", гл.8 первой части в обоих изданиях остались без автора, но рецензент безошибочно определил, что они написаны проф.В.Ф.Берковым.

Оба издания учебного пособия подразделяются на две части. В первой – Предисловие, Введение и 8 глав – раскрывается содержание логики как науки. Во второй части – Приложения логики – в отдельных главах рассматриваются научное познание, общение (словесный диалог), обучение, управление, техника и текст. "Вместо заключения. Краткий очерк истории логики" в равной мере относится к обоим частям.

Деление учебного пособия на две части следует признать оправданным и продуктивным. Во-первых, предметная область науки логики значительно расширяется. Во-вторых, раскрывается не только взаимосвязь и взаимообусловленность содержания логики и других наук, но и плодотворное взаимовлияние, способствующее дальнейшему их развитию.

Характерны в этом отношении главы второй части. В них на интересном фактическом материале, в доступной форме раскрыто широкое применение логических знаний в личной и общественной жизни людей, научной и культурной деятельности.

Вместе с тем понятие "приложения логики" весьма велико по объему. Оно позволило проф. В.М.Беркову с достаточным основанием включить во вторую часть самостоятельную небольшую главу "Техника", в которой творческая мысль автора пульсирует не менее интенсивно, чем в других объемных главах. Он отмечает глубокое сходство (изоморфизм) "между отношениями в логике высказываний и в технических устройствах дискретного (прерывистого) действия" (Логика. 1997. С.378). Более того, "...теория алгоритмов, теория рекурсивных функций имеют большое значение для создания современных компьютерных систем. Без достижений в области этих теорий был бы невозможен научно-технический прогресс в XX веке" (Там же. С.382).

Очевидно, что возможности применения логических идей в технике и техническом прогрессе в этой главе только намечены. Надо надеяться, что они будут развиты автором в последующих изданиях "Логики".

Нам представляется, что целесообразнее было бы сузить "приложения логики" и конкретизировать их содержание применительно к вузовским запросам. Например, "Педагогические приложения логики" (Логика и педагогика, Логика, обучение и воспитание в вузе, Логические основания методов обучения и воспитания студентов и др.).

Изложение содержания логики как науки начинается Введением, в котором определяется предмет логики как науки, главами Высказывания, Имена, Силлогистические выводы, Отношения, Недедуктивные (вероятностные) выводы, Модальности, Вопросы и ответы и Логические системы.

Такая структура вполне приемлема и продуктивна. Она позволила авторам совместить формально-логическую строгость и последовательность с "живым" содержанием логических форм и средств.

Структура глав также логична и содержательна. Параграфы строго и четко формулируются, содержание их последовательно развивается, иллюстрируется разнообразным фактическим материалом. В конце параграфов даются упражнения, решение которых гарантирует сознательное и прочное усвоение студентом логического содержания.

В конце книги даются ответы к упражнениям, приводится список рекомендуемой литературы, предметный указатель.

Учебное пособие выделяется среди подобных рядом положительных и отличительных особенностей. Авторы стремятся сочетать закономерности и требования формальной и диалектической логики. "Сейчас стало немодным, – пишет проф. В.М.Берков, – ссылаться на классиков диалектического материализма. Представляется, что это неправильный, конъюнктурный подход" (Там же. С.261). В "Логике" умело и творчески используются новейшие достижения логики, гносеологии и методологии, выдвигаются интересные идеи о необходимости дальнейших исследований различных аспектов логической науки (логические основы процесса общения, логика и риторика, логика и системы искусственного интеллекта и др.).

К сожалению, пособие не лишено недостатков. Так, название первой части – "Логический анализ языковых выражений" – не соответствует содержанию большинства глав. К тому же оно отделяет "Введение.Предмет логики как науки" от последующих тем курса логики. По замыслу авторов название второй главы "Имена" должно соответствовать логической форме "понятие". Но даже в "Предисловии" авторы не соблюдают этого тождества и свободно употребляют словосочетания: "содержание понятий", "понятийно-терминологический аппарат" (Там же. С.4), "дефиниции основных понятий" (С.5), ничего не разъясняя, в чем заключается смысл имен и смысл понятий. В главах "Отношения", "Модальности" – первой части, "Техника" – второй части в отличие от других глав отсутствуют параграфы. В предметном указателе приводятся не все термины, употребленные в тексте.